■ Надвор'е

# І ПРЫЙДЗЕ СПЯКОТА З ПОЎДНЯ ЕЎРОПЫ

## 3 чацвярга сіноптыкі абяцаюць павелічэнне тэмпературы да 32 цяпла

**Сёння тэрыторыя краіны трапіць у зону павышанага атмасфернага ціску, аднак толькі ў паўночных раёнах будзе яшчэ адчувацца ўплыў няўстойлівых паветраных мас. Чакаецца пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў, толькі месцамі па поўначы пройдуць кароткачасовыя дажджы, паведамляюць спецыялісты Белгідраметцэнтра.**

Вецер паўночна-заходні ўмераны, па ўсходзе парывісты. Максімальная тэмпература паветра ў аўторак складзе ад плюс 19 градусаў па паўночным усходзе да 26 цяпла па паўднёвым захадзе краіны. У сераду ўмовы надвор'я будзе вызначаць малаактыўны атмасферны фронт, які рухаецца да нас з тэрыторыі Польшчы. Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Удзень у асобных раёнах чакаецца моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы на сераду складзе плюс 10-17 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 19 цяпла, удзень будзе плюс 19-26 градусаў, а па поўдні — да 28 цяпла.

Уначы на 23 ліпеня тэрыторыя краіны будзе знаходзіцца ў полі павышанага атмасфернага ціску, а ўдзень чакаецца паступленне няўстойлівых цёплых паветраных мас з паўднёвага захаду Еўропы. Таму ўначы прагназуецца пераважна без ападкаў, аднак ужо ўдзень месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. У асобных раёнах пры навальніцах моцны парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы на чацвер стане 9-15 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 17, удзень будзе плюс 21-28 градусаў, а па поўдні прыпячэ да 29-32 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ Добрая навіна

# ПА ЛЬГОТНАЙ ПРАГРАМЕ

## 120 ВЫСТАЎ-ПРОДАЖАЎ ТАВАРАЎ ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ ПРОЙДЗЕ Ў ГАНДЛЁВАЙ СЕТЦЫ МІНСКА ДА КАНЦА ЛЕТА

**Таксама ў сталічных магазінах адбудзецца каля 25 дэманстрацый мадэляў адзення, абутку, школьнай галантарэі з удзелам прадпрыемстваў-вытворцаў, уручэннем прызоў і падарункаў. Акрамя таго ў пакупнікоў будзе магчымасць купіць тавары да школы ў растэрміноўку без пераплаты.**

Ва ўнівермагу «Беларусь», напрыклад, пройдуць акцыі са зніжкай 20% на ўсе нехарчовыя тавары, ГУМ па 30 верасня дае пакупнікам магчымасць набыць тавары школьнага асартыменту ў крэдыт ад 2 да 6 месяцаў без выплаты працэнтаў з першапачатковым узносам 10% пры куплі на суму ад Br1 млн і вышэй.

У фірменных крамах «Прамень» у жнівўні шматдзетным сем'ям і сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі, падораць зніжку 15% пры куплі абутку айчыннай вытворчасці.

Падобныя акцыі адбудуцца і ў іншых буйных гандлёвых цэнтрах сталіцы. Дарэчы, у гандлёвай сетцы горада працуюць праграмы па продажы тавараў на льготных умовах розным катэгорыям грамадзян, у тым ліку шматдзетным сем'ям, якім універмагі прадастаўляюць 10-працэнтную зніжку на нехарчовыя тавары, у тым ліку школьнага асартыменту.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ**

■ Прыёмная кампанія — 2015

# Ці спатрэбіцца дадатковы набор на бюджэтныя месцы?

**Папярэднімі вынікамі прыёмнай кампаніі ў ВНУ міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў застаўся задаволены. Для таго, каб марыць пра студэнцкі білет, на многіх спецыяльнасцях абітурыенты павінны былі набраць у суме не менш як 300 балаў. З вельмі высокімі баламі прыйшлі абітурыенты ў БДУ, БДУІР, Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, Акадэмію МУС і ў медыцынскія ўніверсітэты.**




Па словах Міхаіла Жураўкова, ёсць ВНУ, дзе па выніках падачы заяў пакуль што назіраецца невялікі недабор — ад аднаго да трох бюджэтных месцаў. Праведзенне дадатковага набору можа спатрэбіцца Віцебскаму дзяржаўнаму тэхналагічнаму ўніверсітэту, Гомельскаму дзяржаўнаму тэхнічнаму ўніверсітэту імя П.В. Сухога, Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, Магілёўскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя А.А. Куляшова і некалькім іншым ВНУ. Пра сваё рашэнне праводзіць дадатковы набор кіраўніцтва ВНУ паведаміць праз афіцыйны сайт установы адукацыі і прыёмную камісію.

Кіраўнік ведамства адзначыў, што па выніках прыёмнай кампаніі будуць зроблены высновы па выкладанні профільных дысцыплін у школах, у першую чаргу гэта тычыцца ўзроўню выкладання. «У цэлым, калі прааналізаваць нават папярэднія вынікі цэнтралізаванага тэсціравання, то ў Беларусі назіраецца станоўчая дынаміка — дзеці сталі больш адказна ставіцца да паступлення. Для якаснай працы ў будучыні ўжо прайшла нарада па далейшай мадэрнізацыі цэнтралізаванага тэсціравання і выпускных выпрабаванняў», — паведаміў ён.

У гэтым годзе абітурыенты актыўна нясуць дакументы і на бюджэтную скарочаную форму навучання. Сістэма беспераптыннай адукацыі становіцца ўсё больш запатрабаванай: моладзь больш усвядомлена ідзе ў каледжы і ліцэі, пасля завяршэння якіх паступае на скарочаную форму навучання ў ВНУ.

Асабліва Міхаіл Жураўкоў адзначыў праведзенне ўступнай кампаніі ў ССНУ і ПТВ: «Вельмі прыемна, што палепшылася сітуацыя з паступленнем у каледжы і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы. Плануем і далей актыўна рэкламаваць сістэму ранняй прафілізацыі ў напрамку інжынерных спецыяльнасцяў. Распавядаць дзецям пра перавагі беспераптыннага навучання — праз прафесійны ліцэй і каледж да вышэйшай адукацыі».

Нагадаем, што цяпер яшчэ адкрыты прыём дакументаў для грамадзян Украіны — жыхароў Луганскай і Данецкай абласцей, якія хочуць атрымаць адукацыю ва ўстановах адукацыі Беларусі.

Канчатковыя вынікі ўступнай кампаніі будуць падведзены пасля яе завяршэння — не раней за сярэдзіну жніўня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaiva@zviazda.by*

■ Прафсаюзны рух

# БЫЦЬ ЛІДАРАМ

## навучаць падчас міжнароднага маладзёжнага форуму

**Учора на спартыўна-аздараўленчай базе ў Ратамцы распачаўся міжнародны маладзёжны прафсаюзны адукацыйны форум «Тэмп—2015». Гэты маштабны праект аб'яднаў лепшых студэнтаў і рабочых Беларусі, Расіі, Малдовы, Кыргызстана, Азербайджана, Таджыкістана, Казахстана і Кіпра. Падчас форуму моладзь сустрэнецца з бізнесменамі і прадстаўнікамі дзяржструктур, зможа праявіць свае лідарскі патэнцыял, больш даведаецца пра ролю прафсаюза, які абараняе іх правы і інтарэсы.**

У панядзелак — дзень творчасці і нацыянальных культур — госці праекта пазнаёміліся з беларускімі традыцыямі. Удзельнікі форуму выраблялі імянныя манеты, спрабавалі сябе ў ганчарным мастацтве, пляценні з саломы і ткацтве. Падчас аднаго з трэнінгаў старшы выкладчык Расійскага эканамічнага ўніверсітэта імя Пляханава Ларыса Коркіна і саветнік упраўлення культурнай палітыкі і дзяржаўных праграм дэпартамента культуры Масквы Юлія Сямёнава вучылі студэнтаў працаваць у камандзе і размяркоўваць абавязкі.

Сёння — у дзень права, палітыкі, міжнародных адносін і прафсаюзнага лідарства — фарумчане сустрэнуцца з намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігарам Бузоўскім і старшынёй Белтэлерадыёкампаніі Генадзем Давыдзькам. Працягам дыскусіі стане пасяджэнне Міжнароднай маладзёжнай групы па пытаннях маладзёжнай палітыкі ў прафсаюзах.

Серада будзе прысвечана тэме бізнесу, інавацыям, медыя- і інфармацыйным плыням. Каб пазнаёміцца з працай журналістаў «знутры», моладзь наведае офісы Белтэлерадыёкампаніі, АНТ, СТБ і «Нового радио» (прафсаюзныя СМІ). Крыху пазней дырэктар інтэрнэт-партала Gorodvitebsk.by Андрэй Лапін і распрацоўшчык мабільнай праграмы «Хімія Х10» Павел Бацылеў раскажуць, як трэба развіваць уласныя праекты, а ўвечары моладзь чакае пазнавальная сустрэча з менеджарам спецыяльных праектаў кампаніі Wargaming Андрэем Шубадзёравым і каардынатарам праектаў у сферы інфапліняў Міхаілам Ждановым (Расія).

Чацвер абвешчаны днём рэлігіі. Разважаць над пытаннямі веры студэнты змогуць разам з Мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі Паўлам. А пятніцу, апошні дзень міжнароднага форуму, моладзь прысвеціць здароўю і экалогіі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ У мірным небе

# Рэкордная прыгажосць!

**У суботу дзясяткі паветраных шароў над сталіцай распачалі фестываль авіяцыйнага спорту «70 гадоў мірнага неба». Сотні мінчан назіралі за гэтай неверагоднай па прыгажосці падзеяй са стартавай пляцоўкі, а пасля — і з уласных кватэр, бо рознакаляровыя лятальныя апараты было відаць амаль з любога месца горада.**







Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дарэчы, запуск аэрастатаў быў далёка не адзіным мерапрыемствам фестывалю. Верталётныя гонкі, купальная парашутная акрабатыка, скокі парашутыстаў з гранічнай вышыні 200 метраў, масавы дэсант, паказальнае выступленне на самалёце «Як-52», запуск паветраных змеяў і многае іншае можна было пабачыць у Мінску на мінулых выхадных.

— Зараз цяжка дзяліцца эмоцыямі, бо ўсе мы надта стаміліся, — расказаў «Звяздзе» адзін з арганізатараў фестывалю, **генеральны сакратар Беларускай федэрацыі авіяцыйнага спорту Антон БЫСТРОЎ**. — Галоўнае — пашанцавала з надвор'ем. Самі бачыце, два дні была пагода, якраз на іх і прыпаў фестываль. Увогуле, па многіх паказчыках ён пераўзышоў нашы чаканні. Напрыклад, па падліках міліцыі, з аэрадрома ў Баравой за ім назірала 20—25 тысяч чалавек, і гэта не можа не радаваць. Цяпер займаемся складаннем заяўкі для Кнігі рэкордаў Гінеса, бо столькі паветраных шароў ніколі яшчэ не ўздымалася ў неба над сталіцай якой-небудзь краіны. Ці будзе ў хуткім часе нешта падобнае ў Беларусі яшчэ — сказаць цяжка. Пакуль нам трэба супакоіцца і «пераварыць» вынікі фестывалю.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*